Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# Калгаснік Капыльшчыны

№ 13 (1766) ПЯТНИЦА 24 сакавика 1944 г.

Орган Капыльскага РК КП(б)Б.

**Смерць нямецким акупантам!**

Цяпер Чырвоная Армия па спяхова завяршае вызвален не Украинскай зямли ад нем цау. Ужо видаць Карпацкия горы. Ужо Днестр за спиною наступаючых часцей Чырвонай Армии. Ужо вызваляюцца земли Малдаускай Совецкай Рэспублики.

[З перадавога артыкула „Правды" ад 20/III 1944 г.]

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Агляд ваенных дзеянняу за час з 17 па 23 сакавика 1944 г.**

Войски 1-га Украинскага фронта 17 сакавика авалодали горадам Дубно—важным апорным пунктам абароны немцау на Львоуским напрамку. 18 сакавика войски фронта, у выніку двухдзенных упорных баеу, авалодали аператыуна важным вузлом чыгунак и горадам Жмерынка. 19 сакавика войски фронта авалодали горадам Крэменец—магутнай прыроднай крэпасцю на хрэбце Крэменецких гор, узмоцненай немцами сеткай штучных абаронных пабудаванняу.

20 сакавика войски 1-га Украинскага фронта, у выніку штурма и абходнага манеура з флангау, авалодали абласным и буйным прамысловым цэнтрам Украины—горадам Винница.

На-днях войски 1-га Украинскага фронта, узнавиушы наступленне на участку Тарнопаль-Праскурау, прарвали абарону працiуника, за 3 дни наступальных баёу прасунулися уперад ад 40 да 60 клм. У ходзе наступлення нашы войски авалодали райцэнтрами Тарнопальскай области горадам и буйным чыгуначным вузлом Капычынцы, горадам Трэмбоуля, Микулинцы, Грымайлава, райцэнтрам Каменец-Падольскай обл. Фельшцин, а таксама занялі больш 200 других населеных пунктау. Пад ударам нашых войск працiуник панёс велизэрныя страты у жывой силе и тэхницы.

Войски 2-га Украинскага фронта, працягваючы наступленне, авалодали гарадами Новаукраинка, Памошная.

18 сакавика нашы войски выйшли на раку Днестр и авалодали горадам Ямполь. 19 сакавика войски 2-га Украинскага фронта выйшли на раку Днестр на фронце больш 100 клм., фарсиравали яго на участку працягам звыш 50 клм., занялі на правым беразе раки больш 40 населеных пунктау, у тым ліку уездны горад Малдаускай ССР—Сароки. У выніку имклівага манеура танкавых злучэнняу и пяхоты, войски фронта 19 сакавика авалодали горадам Магилеу-Падольски—важным апорным пунктам абароны немцау на Днястры.

На працягу 21, 22 и 23 сакавика нашы войски на поудзень ад горада Магилеу-Падольски, працягваючы весци паспяховыя баи па расшырэнню пладцарма на правым беразе Днястра, авалодали райцэнтрами Малдаускай ССР Атаки, Надушыта, г. Рышканаука, Тырнова, Вертюжаны, а таксама з баями занялі больш 95 других населеных пунктау.

Войски 2-га Украинскага фронта 22 сакавика, пасля двухдзенных упорных баёу, авалодали горадам Першамайск—важным чыгуначным вузлом и моцным апорным пунктам абароны немцау на сярэднім цячэнни Паудневага Буга.

На Никалаеуским напрамку нашы войски прадаужали весци баи па ачышчэнню ад працiуника усходняга берагу раки Паудневы Буг, уплатную падыйшли к гораду Вазнесенск и завязали баи на акраинах горада.

За прайшоушыя 7 дзён нашы войски на Украине и Малдавии вызвалили ад нямецка-фашысцких захопнікау звыш 1960 населеных пунктау и 49 гарадоу и раённых цэнтрау.

## Паведамленне аб совецка-финских адносинах

1 сакавика информбюро Наркамата Замежных Спрау апубликавала совецкия умовы перамир'я, перададзеныя Совецким Урадам Финляндыи.

8 сакавика совецкай миссияй у Стокгольме быу атрыман адказ Финскага Ураду. З гэтага адказа выходзила, што Фински Урад затрудняецца прыняць совецкия умовы перамир'я без папярэдняй дыскусии.

10 сакавика Совецки Урад паведамиу Финскаму Ураду, што Совецки Урад лічыць фински адказ нездавальняючым. Пры гэтым Совецки Урад звярнуу увагу Финскага Урада на тое, што совецкия умовы перамир'я у выглядзе шасци пунктау, перададзеныя пану Паасикиви, з'уляюцца минимальными и элементарными и што толькі пры прыняцци гэтых умоу Финским Урадам магчымы совецка-финския перагаворы аб спыненни ваенных дзеянняу. Совецки Урад паведамиу таксама, што ён будзе чакаць адказ Финскага Ураду да 18 сакавика.

17 сакавика Фински Урад дау па поваду совецкага заяулення адмоуны адказ и тым самым узяу на сябе усю адказнасць за паследства.

**Информбюро Наркамата Замежных Спрау.**

---

20 сакавика нямецкае радыё перадало паведамленне аб тым, што совецкия самалёты быццам-бы бамбардзиравали Хельсинки 19 сакавика.

Совинформбюро можа з поуным асканаваннем заявиць, што гэта нямецкае паведамленне з'уляецца хлуслівым.

## АПРАВЯРЖЭННЕ ТАСС

Па паведамленню шведскага друку, швейцарская газета „Журналь де Жэнев“ распаусюджвае слухи аб тым, што быццам-бы румынскаму прадстаунику князю Штырбею были уручаны у Анкары „руския умовы перамир'я, адобраныя Англа-саксоняй“. Гэтыя умовы быццам-бы складаюцца з сями пунктау и змяшчаюць у сабе пункты аб совецка-румынскай границы, аб звароце Трансильвании Румынии, аб адказе Совецкага Саюза ад кантрыбуцыи и таму падобнае.

ТАСС упаунаважан апрavергнуць гэта паведамленне, як выдуманае, и заявиць, што наогул никаких совецких умоу Штырбею, або якому-ни будзь другому румынскаму прадстаунику, не перадавалася.

## „Айчынны Фронт“ у Румынии

**Стамбул, 17 сакавика. [ТАСС].** Атрыманы некаторыя звестки аб дзейнасци у маштабах створанага у Румынии „Айчыннага фронта“. Згодна гэтым звесткам, „Айчынны фронт“ у сваим имкненни к миру з СССР и яго саюзниками набывае усё большы лик прыхильникау у Румынии. Кираунiки „Айчыннага фронта“ пакуль яшчэ прадпачытаюць аставацца невядомыми.

Праграма „Айчыннага фронта“ змяшчае у сабе сем пунктау:

1. Неадкладны выхад з „германскай вайны“ и далучэнне к дэмакратычным краинам;
2. Выгнанне немцау з Румынии;
3. Звяржэнне урада Антанэссно;
4. Утварэнне поддиннa нацыянальнага урада;
5. Устанауленне дэмакратычных прау и свабод;
6. Вызваленне з турмау усих патрыётау;
7. Наказанне гитлерауских виноунiкау вайны.

Тэкст праграмы заканчваецца славами: „Далоу гитлерауску Германию! Няхай живе свабодная и незалежная Румыния!“

„Айчынны фронт“ выдае сваю падпольную газету „Свабодная Румыния“, у якой прызывае згуртоувацъ усе антыгитлерауския силы Румынии, незалежна ад их палитычных поглядау.

## Баи памиж вэнгерскими и румынскими войскамi

**Лондан, 22 сакавика (ТАСС).** Як перадае агенцтва з Цюрыха згодна паведамленням, атрыманым Цюрыхскими дыпламатычными кругами церaз Бухарэст, на Вэнгерска-Румынскай границы працягваюцца сутычки памиж вэнгерскими и румынскими войсками. Гэтыя сутычки у некаторых мясцах, у прыватнасци у Араве и Надь-Вараве, дзе румыны спрабавали прарвацца праз границу, перaтварылися у сапраудныя баи.

## Заняцце немцами пошты и тэлеграфа у Софии

**Лондан, 22 сакавика (ТАСС).** Агенцтва Рэйтэр перадало радыёмоляню з Берна аб тым, што Анкарскае радыё паведамила вечарам 21 сакавика аб заняцци немцами пошты и тэлеграфа у Софии.

## Бамбардыроука Бэрлина

**Лондан, 22 сакавика. [ТАСС].** Як перадае агенцтва Рэйтэр, буйныя злучэнни амерыканских бамбардыроушчыкау падвергли бамбардыроуцы ваенныя и прамысловыя аб'екты у Берлине.

Английскае министэрства авияцыи паведамляе аб тым, што у ноч на 22 сакавика самалёты „Москита“ атакавали аб'екты у Заходняй Германии.

## Падрыунiки выконваюць загад правадыра

Выдатка дзейнiчаюць ды-версийныя групы Н-скага ат-рада. Кожны дзень ляцяць у паветра варожыя аутама-шыны.

◆◆ 9 сакавика на дарозе Масква-Варшава узляцела у паветра 7-тонная нямецкая аутамашына з харчаваннем. Забита 5 немцау. Мина была залажана групай тавары-ша Ю.

◆◆ 10 сакавика ад узрыва мины разляцелася ушчэнт другая 7-тонная нямецкая аутамашына на дарозе Стоуб-цы-Несвиж. Дыверсия была арганизавана таварышам С. Пры узрыве забиты 2 фры-цы.

◆◆ Група партызан на ча-ле з таварышам Ф. 10 сака-вика на шасе Масква-Варша-ва узарвала аутамашыну пра-циуника з грузам. Ехаушыя у машыне 2 немцы налажы-ли галовы.

◆◆ 17 сакавика на участку дароги Лешня-Киевичы на мине узарвалася аутамаши-на. Гэта работа вопытнага падрыунiка тав. Зубрыцкага. 4 забитых и 8 раненых фры-цы—таки вынiк узрыва.

◆◆ Комсамольская група, дзе старшым таварыш З., у ноч на 13 сакавика залажы-ла мину на дарозе Отцеда-Коласава. Па гравейцы ишли 18 машын з жывой силай працiуника. Першая прай-шла, а другая наскочыла на мину и узляцела у па-ветра. Узрывам забита 8 и ранена 7 гитлерауцау.

Так выконваюць загад та-варыша Сталина партыза-ны-падрыунiки атрада, дзе камандзiрам Иван Г. и ка-миcарам Николай Н.

В. Г.

## Узарвали варожы эшалон

12 сакавика група парты-зан Н-скага атрада на мине узарвала эшалон працiунi-ка на чыгунцы ля станцыи М. Разбит паравоз и 8 ваго-нау.

А. С.

РЭДКАЛЕГИЯ